
Лёля Багдановіч
КАЛЕЙДАСКОП
ЛЕТУЦЕННЯЎ

Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Лёля БАГДАНОВІЧ

# КАЛЕЙДАСКОП ЛЕТУЦЕННЯЎ

вершы

2023

Электронная бібліятэка
Мінскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

*Серыя заснавана ў 2023 годзе*

Пад рэдакцыяй Р. Ю. Малахоўскага

№ 003

**Багдановіч, Л. У.**
Калейдаскоп летуценняў : вершы / Лёля Багдановіч. — Мінск : МАА СПБ, 2023. — 81 с. (Электронная бібліятэка).

Электронная кніга Лёлі Багдановіч "Калейдаскоп летуценняў" – шчырая і хвалюючая размова з сучаснікам. Вершы паэткі кранаюць сваёй адкрытасцю, спавядальнасцю і цеплынёй, дапамагаюць выхоўваць у чытача пачуцці дабрыні і спагады, любоў да Радзімы і роднай мовы.

© Багдановіч Л. У., 2023
© Падрыхтоўка, афармленне.
ГА "Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі", 2023

**Мелодыя верша**

На скрыжаванні дабрыні і злосці
Ты нарадзіўся, мой гарэзны верш,
І рэхам бесклапотнай маладосці
Нага ў нагу паўсюль за мной ідзеш.

Гаючыя пра маму ўспаміны,
Кахання горыч, роспач і журба.
Ружовыя каралі журавінаў,
Рамонкаў яснавокіх варажба.

Паданні сівізны дубоў спрадвечных,
Азёраў і вачэй тваіх блакіт,
За ростанямі новыя сустрэчы,
І пошчак салаўіны ля ракі.

Маланкава-вясёлкавае лета,
Сузор'яў хараство, палёт чмяля.
Я буду зноў і зноў пісаць пра гэта,
Ляці ў свет, мелодыя мая.

**Родная мова**

Родная мова – матчына мова.
Ззяе вясёлкай кожнае слова.
Кожная літара – кропля з крыніцы,
Колькі ні піў бы, не наталіцца.

Раны загоіць, дасць паратунак.
Дзедавых гусляў чароўныя струны
Кожнае сэрца спаўюць у пяшчоту,
Умомант прагоняць адчай і самоту.

Пацеркі-гукі складаюцца ў нізку.
Родная мова, голас твой чысты.
Кожнае слоўца зоркай крылатай
Кліча дзяцей да бацькоўскае хаты…

**Якубу Коласу**

Круціцца кола жыцця,
Вёсны ўплятаючы ў леты.
Матчынай мовы дзіця –
Быў ты сапраўдным паэтам.

Жменьку за жменькай збіраў
Ты па зярнятку ў колас.
Бог нездарма табе даў
Гучны, разважлівы голас.

Сын сенажацяў, палёў –
Зведаў і холад, і голад.
Словам праславіў дзядоў,
Мовы гаротнае волат.

Будзе, Якубе, гучаць
Голас твой гімнам стагоддзяў.
І за мяжою чуваць
Водгук дзівосных мелодый…

**У госці да Максіма**

*Максіму Багдановічу*

Я па тваіх, Максім, іду слядах.
З крыніцы п’ю сцюдзёную вадзіцу.
Вось ложак, на каторым ты ляжаў.
У шыбы ліпеньскае сонейка глядзіцца.

Прыйшла я да цябе праз шмат гадоў.
Спазнілася… Даруй ты мне, Максіме.
З букетам невялічкім васількоў.
Я кветкі на стале тваім пакіну.

Напэўна, мы з табою не радня,
Хоць прозвішча аднолькавае маем.
Ды, як і ты, у вянок амаль штодня
За кветачкаю кветачку збіраю.

Ляцела сёння да цябе здаля.
На жаль, мы не сустрэнемся ніколі.
О, Ракуцёўшчына – прыгожая зямля!
Для вольнага ўзлёту дум раздолле.

**Ля помніка Янку Купалу**

Мора парасонаў.
Дождж ідзе ізноў.
Да Купалы сёння
Шмат прыйшло сяброў.

Ён, нібыта бацька,
Пазірае ўніз.
Неба – дах у хаце,
Коўдрай дождж павіс.

Дрэвы калыханку
Баяць песняру.
Павітаюць зранку
Браткі па пяру.

Сёння нарадзіўся
Ён на гэты свет.
Сон матулі збыўся –
Неўміруч паэт.

Дожджык зменіць сонца.
Запяе жаўрук.
Песенькай бясконцай –
Вершаў шчырых гук.

Праз гады, стагоддзі
На ўсёй зямлі
Словы ўзыходзяць
Зернем на раллі.

**Спыніся, момант!**

Каханне крылатыя словы
Угору, як птушкі, ляцяць.
Паслухаеш родную мову –
І хочацца песні спяваць.

Пра маці, пяшчоту і згоду,
Пра мужнасць дзядоў і бацькоў,
Пра тое, што помнім заўсёды,
З якіх мы пайшлі каранёў.

Пра тую вярбу, пад каторай
Алёна ўпусціла ручнік,
Пра родны мой край непаўторны,
Пра луга саспелага зык.

Калі дыяментам на золку
Мурог вышывае раса,
Купаецца ў рэчцы вясёлка,
Як скрыпка, спявае каса.

Душа адчыняецца насцеж,
Напоўняцца вочы слязой,
І зойдзецца сэрца ад шчасця:
О момант цудоўны, пастой!

## Паэзія – госця нябесная

Паэзія – госця нябесная:
І радасць, і сум, і адчай,
І сэрца шчымлівая песня,
І слёзы, і боль у вачах.

Адкажа на ласку і здзекі,
У колер жыццё апране.
Паэзія – лепшыя лекі,
Якія ратуюць мяне!

**Мова прыгажосці**

Паэт, мастак і кампазітар,
Як тры вялізныя кіты,
Са словаў, гукаў і палітры
Будуюць вечнасці масты.

Яны стараюцца натхнёна
Спавіць імгненне ў прыгажосць.
У звыклых клопатах штодзённых
Знаходзяць рэдкаснае штосьці.

Уверх па лесвіцы майстэрства
Ім Муза пракладае след.
Пакуль такое ёсць братэрства,
Душою не збяднее свет!

**Матчына мова**

Ты яскравая, гаманлівая,
Мілагучная, сэрцу мілая –
Мова матчына, мова дзедава,
Ды не ўсе цябе зараз ведаюць.

Ты над Прыпяццю, Белай Вежаю –
Мова родная, не замежная.
Вельмі шчырая, дужа простая,
Як пралесачка, ты прыгожая.

І крылатая, і адзіная –
Песняй восені жураўлінаю.
Мова дзедава, мова матчына –
Ты балючая наша спадчына!

**Дзе палыхае зарыва брусніц...**

Сярод лясоў, абшараў і балотаў,
Дзе палыхае зарыва брусніц,
Дзе лесавік вандруе ў доўгіх ботах
І журавінаў – вока не спыніць,
Буслы на сенакосе гаспадараць,
Баравікоў збярэш – паўнюткі мех,
Дзе песціць сонца стомленыя мары
І чуецца дзіцячы звонкі смех,
Гучаць, як гуслі, трапяткія словы –
Яны тут нарадзіліся здаўна.
Нідзе пяшчотней, прыгажэйшай мовы,
Як наша, мілагучная, няма!

**Святло лучыны**

Святло дзядулевай лучыны
Душу дагэтуль грэе мне.
Яно ў нядобрую хвіліну
Заўжды ад болю захіне.

І ўспамінаў тых старонкі:
Талерка-радыё і прас,
Які вугельчыкамі лоўка
Псаваў адзенне мне не раз.

Ля керасінавае лямпы
Чытала гогалеўскі «Вій»,
А вецер тузаў вуха клямкі
І вельмі страшна галасіў.

Бабуля клікала ў ложак,
А мне хацелася чытаць!
Спяшаўся ранак на парожак –
Ужо патрэбна ўставаць.

З чарнілкаю ісці ў школу
Ды несці зноў яе дамоў.
Мой родны кут... Лучына... Мова...–
Выснова ўсіх маіх высноў!

**Мова прадзедаў**

Песціць вуха мілагучная
Мова прадзедаў, дзядоў.
Мо, для іншых і нязручная
Мова нашых каранёў.

Ганарымся, не цураемся –
Наша спадчына яна.
З першым промнем завіхаемся
Разам з ёю дацямна.

Спее ў полі жытнім коласам
Мова Танка, Віткі, Коласа,
У небе жаўранкам звініць
І заўсёды будзе жыць!

Трапяткая, нібы зорачка
Альбо сонейка прамень,
Мова Маўра, Багдановіча –
Кожны крок наш з дня ў дзень!

**Спадчына**

Мне пазайздросціць і найбагаты,
Бо ў меня ёсць спадчына:
Гняздо буслова каля хаты,
Пяшчотай слова матчына.

Вада сцюдзёная ў крыніцы
Ды сонейка вясёлае.
Акраец хлеба на паліцы
Ды песні перапёлачак.

Калядны звон у дзень марозны
І пошчак салаўіны.
Лісток цнатлівае бярозы –
Я ім жыццём павінна.

**Пахне вёска сырадоем**

Пахне вёска сырадоем,
Пахне скошанай травой,
Палыном і зверабоем,
Мёдам, ліпай, лебядой.

Пахне бульбай і смятанай
Кожны вечар, кожны ранак,
Тварагом, блінамі, салам
І цыбуляю таксама.

Пахне хлебам, пахне потам,
Бо не знае выхадных…
Ні хвілінкі без работы:
Дзень як год, а год як міг!

**Мой ранак**

Шкада, не прыйдзе да мяне
Расквечаны вясёлкай ранак.
Ён, як заўсёды, абміне
Мой сціплы, непрыкметны ганак.

І я не буду варушыць
Свой боль гаючым успамінам.
У марах толькі будуць жыць
Дзяцінства прагныя хвіліны.

Ды дзякуй Богу, што было
Усё, што мелася адбыцца.
Сцяжынкі снегам замяло,
А мне вясна дагэтуль сніцца.

Сядзіць на прызбе ў бурках дзед,
Ды бабка тупае ля печы.
Як песню, ціхенька вядзе
Гаворку з мамаю аб нечым.

А мама свеціцца ажно –
Прыгожая ды маладая.
Суседка стукае ў акно –
Яе на вуліцу гукае.

Найлепшы з лепшых успамін –
Дзяцінства бесклапотны ранак
Прывёў адну з такіх хвілін
У сны мае неспадзявана…

**Сэрца Беларусі**

Мой родны Мінск, табою ганаруся.
Ты – волат, працаўнік, ты – прыгажун.
Ты – сэрца васільковай Беларусі
І першая струна ў сугуччы струн.

Чаруюць вока гмахі-пабудовы,
Бібліятэкі куб запаланіў.
Пяшчотай боскаю кранае мова –
На ёй мой дзед і прадзед гаварыў.

І голад перажыў, і ліхалецце,
Цябе не закавалі ў кайданы.
Пад чыстым небам вырастаюць дзеці –
Бацькоў сваіх дастойныя сыны.

Спыняюся на Плошчы Перамогі,
Прад помнікам схіляю галаву.
Сюды вядуць усе шляхі-дарогі.
Хвілінак колькі моўчкі пастаю.

Шукае хтосьці шчасце за мяжою –
Нікога не збіраюся судзіць.
А я ў бядзе і ў радасці з табою
Хачу імгненне кожнае пражыць!

**Зямля бацькоў**

Мая зямелька беларуская:
Дзяцей галоўкі светла-русыя.
Блакіт вачэй – краса азёрная.
Усмешка мамы непаўторная.

Кіпяць балоты журавінамі,
Не злічыш зор начамі сінімі.
Будзённасць святам заварожана.
Жанчыны самыя прыгожыя.

Лясоў пяшчота вока радуе,
Шануюць тут дзядоў і прадзедаў.
У сум і радасць дзён спавітыя,
Жывуць тут людзі працавітыя.

Тут што ні вуліца – гісторыя,
І не збіраюся за мора я –
Мне ўсё тут любае і мілае,
Тут станавілася на крылы я.

Бабуля штохвіліны лашчыла,
Піла пяшчоту з вуснаў матчыных.
І, забаўляючыся гуслямі,
Спявала песні беларускія.

І не схлушу, скажу – удзячная.
Мой лёс вясёлкаю адзначаны.
Усім, што ёсць, табе павінна я –
Зямля бацькоў, зямля былінная!

**Мая вуліца**

Тая вёсачка, тая вулічка
У дзяцінства гукаюць мяне,
Дзе і мамачка, і бабулечка
У пяшчоту мой сум захіне.

Зарасла быллём тая сцежачка,
Дзе пакінула мама сляды.
Ад суседа сусед за межамі
Не хаваўся ніколі тады.

Як адна сям’я, наша вуліца
І ў радасці, і ў бядзе:
Гора здарыцца – усе прытуляцца,
Добра, весела ў грамадзе.

Сірацінáчкай зараз вулічка,
Мая вёсачка – удавой.
Ні хацінáчкі, ні матулечкі.
Двор зарос палыном, крапівой…

**Малая радзіма**

Мая маленькая радзіма –
Кранаюць зорачкі лясы.
Куточак на зямлі адзіны,
Дзе чую продкаў галасы.

Кіёчак згорблены ля ганка,
Вакол матульчыны сляды…
Асірацелая Градзянка
Зусім ссівела праз гады…

За хатаю знікае хата,
Забыліся пра радавод.
І стала вуліца шчарбатай,
Як у старой бабулі рот.

Гады ляцяць, як тое лісце,
Ды я дагэтуль бачу ў снах:
Маленькі брацік у калысцы,
Пяшчота ў маміных вачах.

Мая задумлівая вёска,
Не зберaглі цябе, прабач.
Як адляцяць у вырай весны,
Ты над душой маёй паплач…

**Край бяроз і журавін**

Мая родная старонка –
Край бяроз і журавін.
Пад акном каліны гронка,
Жураўлёў у небе клін.

Водар ліпы і суніцаў
Ды вясёлкавы масток.
Сполах летняй навальніцы,
Павуцінкі валасок.

Васількі ў полі жытнім,
У бары – баравікі.
Ранак, сонейкам спавіты,
Месяц з вудай ля ракі.

Не хачу нікуды ехаць –
Тут мой прадзед жыў і дзед.
Дамавы з дзіравым мехам
Бег за імі след у след.

Мора казак, песень, баек
Нарадзіла тут зямля.
Ганаруся родным краем,
Мова матчына – мая!

**Душа адпачывае**

Пяшчотных колераў гады
У снах маіх вандруюць:
Бабуля пестуе заўжды,
І голас мамы чую.

Над ложкам бачу той партрэт,
Дзе малады вусаты дзед
У форму апрануты –
Напэўна, быў рэкрутам.

У садзе яблынька-антон.
Ёсць груша, вішня, слівы.
Ды напалову з дзядзькам дом –
Мой успамін шчымлівы.

А цётка Вольга, далібог,
Такая ўпраўная, без ног
(Вайна забрала ногі)
Працуе да знямогі:

Чацвёра дзетак, агарод,
Карова, свінні, сад –
Жыццё не цукар і не мёд,
Шчэ й муж быў ёй не рад.

А вось матуля маладая
І ў калысцы брацік.
Душа мая адпачывае
У той маленькай хаце…

**Вуліцы, завулкі і двары**

Дзе пад стрэшкай ластавак гняздзечкі,
У жытнёвым полі васількі,
Дзе цыбаты спеліцца сланечнік,
Там мой брат жыве і землякі.

Вакол вёскі лес стаіць сцяною,
Ягад там, грыбоў – касі касой!
Клікалі да зор крылатых мроі
І паіла раніца расой.

Там мне казкі баяла бабуля,
Дзед арэлі ў неба майстраваў.
З Піцера прывёз унучцы гулі –
Мэблі маім лялькам накупляў.

Колькі было радасці дзіцячай!
Слоў не маю нават перадаць.
Вуліцай збіраліся, няйначай,
На арэлях з цацкамі гуляць.

...Пераблытаў час усе стасункі
Успамінам колішняй пары.
Роднай вёскі адгалоскам гулкім –
Вуліцы,
Завулкі
І двары...

**Дарога дадому**

Прывітанне, любая Градзянка!
Патрапляю ў кожны мамін след...
І лячу з гары ў драўляных санках,
І бабуля рада мне, і дзед.

І бягу ў грыбы з малодшым братам,
У вясёлкавым блукаю сне.
Наступаюць хуценька на пяты
Год за годам вельмі спрытна мне.

Грукаюць па рэйках колы гучна –
Разагнаўся не на жарт цягнік.
Ды матыў шчымлівы, мілагучны –
Той, што думкі лашчыў, раптам знік.

Бо зусім не тая ўжо Градзянка,
І сышлі суседзі на пагост,
Не сустрэне матухна на ганку,
Не пакліча ўлетку сенакос...

Стану прад іконай на калені –
Аб адным я Бога папрашу:
Каб хоць на хвілінку, на імгненне
Абагрэў збалелую душу...

**Паланянка**

А за акном у пацерках рабіна.
Спякотай ліпень дыхае ў твар.
Мой родны кут! За Грэбляй журавіннай
Баравікі з маіх дзіцячых мар.

На Стане курачак – і кошыка не хопіць,
Краснагаловікаў вялізная сям'я!
А татка з мамай безупынна сочаць,
Каб не згубілася ў лесе я.

Лісічак столькі – вокам не акінуць!
Махавікоў пад мохам – не злічыць!
Мой родны, непаўторны, мой адзіны
Куточак, дзе вучылася хадзіць...

Пяшчота мая боская – Градзянка.
Ты мая мова, радасць і любоў!
Я слоў тваіх і вуліц паланянка,
І лёсам вышываных ручнікоў!

**Талісманы вернасці**

Той дызель, Асіповічы – Градзянка, –
Юнацтва майго й сталасці маршрут.
І восені, і вёснаў калыханка,
І радасці, і мараў, і пакут.

Бяру білет, саджуся ля акенца
Ды прагна пазіраю праз яго.
Выскоквае ад хвалявання сэрца,
Трапеча немаведама чаго...

Прыпынкі ўсе да воднага знаёмы:
Вось Верайцы, і Лапічы, і Цэль.
Уборак, Пагарэлае... – я дома!
Прабачце, не сказала аб рацэ.

Аб Свіслачы, што зарастае зараз –
Балюча на такое пазіраць...
І толькі лебедзі прыгожай белай парай,
Як талісманы вернасці, сядзяць...

**Раніца ў вёсцы**

Праменьчык ранішняга сонца
Нізае пацеркі расы.
І льюцца песняю бясконцай
Вясёлых птушак галасы.

Чаруе мама каля печкі –
Пячэ духмяныя бліны
Ды ў патэльню б’е яечкі,
Кідае сала крышаны.

Шчэ горад спіць салодка, пэўна,
Чарговы бачыць дзіўны сон.
А ў сяле ўстануць з пеўнем.
Ды цэлы дзень – верацяном.

**Пяшчоты не стае**

*Светлай памяці мамы*

Мне не хапае маміных парад,
Хоць не заўжды іх брала за выснову...
Каб час згадзіўся павярнуць назад,
Да кожнага прыслухалася б слова!

Мне не хапае маміных вачэй,
Шчымлівых слоў: «Спі, любая дачушка!»
Каб іх пачуць, ляцела б я хутчэй
Маланкі нават, а не толькі птушкі...

Пяшчоты не хапае мне яе –
Так хочацца да мамы прытуліцца!
Як ночка зорнай коўдраю спаўе,
Спрабую той пяшчотай наталіцца...

**Без мамы**

Як некалі, схіліся нада мной,
Ухутай коўдрай, пажадай мне добрай ночы.
Хвілінак колькі ля мяне пастой,
Бо сэрца адпускаць цябе не хоча...

Мне гэтак не хапае тваіх слоў!
Тваіх вачэй і рук, тваёй усмешкі!
Я запытаю ў злосных перуноў,
Мо бачылі яны дзе тваю сцежку...

У ветра паспрабую запытаць,
Ці не знаходзіў дзе твае слядочкі...
Я буду дзень і ноч цябе гукаць,
Заглядваючы ў кожныя куточкі...

Надзею не губляючы ані,
Да зорачак звярнуся я таксама.
І зорачкі адкажуць мне: «Зірні,
Дык вось жа, яна з намі твая мама!»

**Атручанае рэха**

За што нам гэткая бяда?
Ці ж беларусы таго варты?!
Чарнобыль столькі гора даў –
Жыццё пастаўлена на карту.

Заўчасна пакідаюць свет
Не толькі сталыя – малыя!
Атручаны звярыны след,
Вада і пушчы векавыя.

Ды пазіраюць з-пад бяроз
Блакітнавокія пралескі.
Буслы ляцяць на сенакос.
Вясёлка выспела над лесам.

Жыццё бяжыць, як і заўжды:
Спяваюць птушкі, сонца ззяе.
…А рэха ад тае бяды
Яшчэ й дагэтуль пазяхае…

**Роздум**

У спадчыну мне Богам дадзена
Зямля бацькоў, дзядоў і прадзедаў.
З лугамі роснымі, мурожнымі
І са світанкамі прыгожымі.

Нябёсы чыстыя, блакітныя,
У роздум зорных мар спавітыя,
Лясы, дубравы неабсяжныя,
Буслы на сенакосе важныя.

Вада гаючая ў крыніцы
І подых летняй навальніцы,
Завея вечарам зімовым,
Пяшчотныя матулі словы.

Галінка яблынькі ў акенцы
Ды скрып маснічыны ў сенцах,
Накрыты стол льняным абрусам
І гонар звацца беларусам!

**Развітальная**

Над Беларуссю сумным клінам гусі
Развітваюцца з намі да вясны.
І непаўторнасць фарбаў Беларусі
Пяшчотаю прыходзіць у іх сны.

Ляцяць і дзень, і ноч няспынным клінам
Праз пыл стагоддзяў, роспачы Сусвет,
Каб зноў вярнуцца ў той куток адзіны,
Дзе дыхае спагадай кожны след.

У добры шлях! Ляціце з Богам, гусі!
Хай стома вашы крылы не спаўе
І кожны год пад дахам Беларусі
Любоў і вернасць гнёзды свае ўе.

Няхай цяпла і дабрыні крыніца
Святла струмені шчырасцю пралье,
Запалыхае ў небе бліскавіцай
Ды песню развітальную спяе.

**Прызнанне**

Табе адной маё прызнанне,
Куточак родны – Беларусь.
Удзень, увечары і ўранні
К табе я сэрцайкам хінусь.

Табе адной спяваю песні,
З табою ў шчасці і ў бядзе.
Зімой, улетку альбо ўвесну
Прытулак мрояў і надзей.

Бо ты – зямля маіх нашчадкаў,
Дзядоў і прадзедаў зямля.
Хай не заўжды бывае гладка,
Табе за ўсё ўдзячна я.

За гоман восеньскіх палеткаў
І за срабрысты звон ракі,
За шчэбет ластаўкі, за кветкі,
За дождж, вясёлку, ручайкі.

За поўны-поўны кораб зерня,
За завіруху і мароз.
Мой шлях ніколі ўбок не зверне,
Бо я – дачка тваіх бяроз.

**Зарапад летуценняў**

Я апрану ў колер думкі
І фарбы выберу сама.
Пячэ халодным пацалункам
Пад белай коўдраю зіма.
А мне так хочацца вясёлкі,
Шчымлівых спеваў ручайка,
Усмешкі сонейка на золку
І закаханага шпачка,
Духмянай бэзавай галінкі,
Пралесак шчырых вачанят,
Пяшчоты мамінай хвілінку
І летуценняў зарапад!

**Спяшаюся ў лес**

Багацце, прыгажосць і гонар,
Жыцця і адпачынку змест.
Камусьці хочацца на мора,
А я спяшаюся ў лес!

Праменьчык сонца лашчыць мары,
Пад ногі сыплецца раса,
Пішчыць на вуха мне камарык –
Заблытаўся ў валасах.

Іду разважлівай хадою
У лес, нібыта ў Божы храм.
Галінка хрусне пад нагою,
Другая дакранецца хмар.

Салодка птушачкі гамоняць,
З-пад елкі глянуў баравік,
Зайграла пчолка ў гармонік,
А тут, відаць, капаўся дзік!

І стала неяк страшнавата –
Не трэба жарты жартаваць.
Лес для звяроў і птушак – хата,
А госць і чэсць павінен знаць.

Дальбог, сунічная паляна!
Збірай у кош і ў прыпол.
Пацешыў вельмі летні ранак –
Паставіць будзе што на стол.

Ужо й дадому час збірацца.
Бадзёры выгляд і настрой.
Памаладзела год на дваццаць,
І ягад – поўны кош з гарой!

**Паркалёвыя мары**

Расплятае лета косы,
І няспыннай чарадой
Зоркі падаюць у росы,
А духмяныя пракосы
Сцелюць водар і спакой.

Песціць лецейка пяшчотай
Ад зары і да зары.
І штодня таўкуць з ахвотай
У вялізных чорных ботах
Мак у ступе камары.

Дождж сыпне вадзіцы жменю –
Каляровым ручайком
Промні-кропелькі-струмені
Сеюць дробнае насенне
Над вясёлкавым мастком.

Запрашае лета ў госці,
Маладзік заве да зор.
Расплятае лета косы,
Вышывае прыгажосцю
Паркалёвых мар шацёр…

**Мілагучнасць лета**

Заплятае лета ў косы
Васілёчкі і рамонкі,
Навальніцы адгалосак
І расы квяцістай гронкі.

Гоман ліўня, пах маліны,
Нізку пацерак вясёлкі,
Рэха песні жураўлінай,
Подых ветрыка на золку.

Мроі зорачкі крылатай,
Той, што ў студні начавала,
Цеплыню бацькоўскай хаты,
Дзе матуля мне спявала...

**Зімовым вечарам**

На парозе вечар зімовы.
Ён падкраўся зусім незнарок.
Нанасіла ў хату дроў.
Змрок на ложак за печчу прылёг.

Стала цёмна і сумна адразу.
Я з вядзерцам пайшла па ваду.
Дамавы мёдам лусту намазаў
Ды на каву гарачую дуў.

А сняжыначкі дробна цярушаць –
Хопіць раніцай справы ўсім:
Замяце пад страху ажно, мусіць.
Пазяхае праз коміны дым.

Вечар з ранкам гуляе ў жмуркі.
Ноч кудзелю пры свечцы прадзе.
Клён стары ў суседнім завулку
Прытуліўся да плоту, як дзед...

**Зоркі ў чоўне**

Зоркі плаваюць у чоўне,
Грае месяц у ражок.
Вечар шаляю шыкоўнай
Захінае шэры змрок.

Камары таўкуць у ступе
Безупынку дробны мак.
Ноч на маміных прыступках
Прымярае зорны фрак.

Спяць і дрэвы, і аблокі.
Ветрык стомлены прыціх.
Не чуваць у хаце крокаў
Ні людзей, ні дамавых.

Цішыня – аглухнуць можна!
Толькі пошчак салаўя
Стужкай яркаю, прыгожай
Ноч спаўе, бы немаўля.

Ды паціху змрок радзее,
Лашчыць сонейка прамень.
І выпешчвае надзею,
Як вясёлку, новы дзень…

**Зіма-чараўніца**

Зімовы ранак лашчыць цішыня.
Галінка ні адна не зварухнецца.
Вітае месяц нараджэнне дня.
Упала зорка сонная ў вядзерца.

Мароз шчыпнуў за рукі спадцішка.
Ну што казаць? Патрэбны рукавіцы.
Пад цёплай коўдрай моцна спіць рака,
Ёй сніцца подых летняй навальніцы.

Махры на плоце. На акне ўзор.
Каліны гронка чырванню палае.
Ды лютым халадам наперакор
Сінічка каля веснічкаў лятае.

Зіма чаруе сэрца хараством.
Ля студні вішня ў карунках белых.
Хоць маразы мацнеюць з кожным днём,
З-за хмары сонца паглядае смела…

**Закаханы шпачок**

Вітае расквечаны ранак
Шпачок, у жыццё закаханы.
Выводзіць за нотаю ноту –
І прэч адступае самота.

І рады той песні бясконца
Маленькая хмарка і сонца,
І ветрык-гарэза гуллівы,
Сінічка, ручай гаманлівы.

І той дамавы апантаны,
Што выскачыў босы на ганак,
Забыўшыся пра асцярожнасць, –
Заслухаўся песняй прыгожай.

Спявак то замрэ, то засвішча
Пад купалам вечнае вышы.
Шпачок, у жыццё закаханы,
Вітае расквечаны ранак…

**Навальніца**

Пякло ўвесь дзень, а ноччу – навальніца.
І дождж, як ашалелы, лупцаваў.
Гром ляскаў, зіхацела бліскавіца.
Пярун да хеўры жару паддаваў.

І вецер надзімаў ад злосці шчокі,
Кідаў галінкі дрэваў у бакі.
Так жудасна зрабілася навокал –
Прыціхлі нават жабы ля ракі.

А раніца аблашчыла пяшчотай,
Праменьчык сонца на шпакоўню сеў.
Шпачок паклаў яму на крыльца ноты –
І сад ад дзіўных гукаў анямеў.

**Абуджэнне**

У суседскім садзе салавей
У пяшчоту спавіваў хвілінкі
Зорнымі карункамі начэй,
Сонейкам з вясёлкай у абдымку.

Гром дастаў з кішэні свой кісет,
Вэлюм шлюбны груша прымярала.
І прыціх на нейкі момант свет
Ад такое песні разудалай.

Ветрык супыніўся. А вясна
Новым цудам вока чаравала:
У пурпурна-белых майскіх снах
Яблынька ў акенца пазірала.

Ушыркі разгарнулася душа,
Ну, няйначай, як зайграў гармонік.
А спявак на свята запрашаў –
Свята абуджэння і гармоніі.

Салаўіны слухаю канцэрт –
За каленцам новае каленца.
Быццам нарадзілася на свет...
Нават крылы выраслі, здаецца...

**Хатынскія званы**

Звіняць хатынскія званы.
Наводзяць сум. Наводзяць жах.
Не ўецца дым праз каміны.
Чарнеюць вуліцы ў крыжах.

Калісьці весела было –
Гучалі жарты тут і смех.
Агнём усё завалакло.
Звіняць званы пад кожнаю са стрэх.

Жанчыны песень не пяюць
З тае страшэннае пары.
Званы бесперастанку б'юць
У кожным спаленым двары.

Пральецца дождж слязьмі дзяцей.
Вясёлка ў неба пабяжыць.
Ад гора гэткага з грудзей
Зямелькі стогн да зор ляціць.

Звіняць хатынскія званы.
І дзень, і ноч яны звіняць.
Чарговы надыход вясны
Ім зноў жалобаю вітаць.

**Брацкая магіла**

На могілках, пры ўваходзе,
Дакорам брацкая магіла.
Уранку сонейка ўзыходзіць,
Між дрэваў расхінае крылы.

Вясною ранняю пралескі
Расплюшчаць дружна вачаняты.
Паміж сялом маім і лесам
Паснулі вечным сном салдаты.

Чытаю прозвішчы, імёны.
А на душы балюча, горка.
– Якімі б вы былі сягоння? –
Сама з сабой вяду гаворку.

Скасіла куля іх навекі.
Не ўстануць, родныя, ніколі.
Пячэ агнём сляза мне вейкі,
А сэрца зойдзецца ад болю.

**Востраў дзяцінства**

Студня ля дзедавай хаты.
Чыста падмецены двор.
Пуня з драбінай гарбатай
Кліча нас з братам да зор.

Гушкалка – мара дзяцінства,
Нам змайстраваў яе дзед.
Яблынька. Шпак на ёй свішча.
Мама заве на абед.

Круціць бабуля машынку –
Штосьці нам шые, відаць.
У рамцы за шклом фотаздымкі:
Пільна з іх продкі глядзяць.

Сонца за хмару садзіцца –
Вось і закончыўся дзень.
Хай жа мне сёння прысніцца
Востраў дзіцячых надзей.

**Халодная хата**

Халодная хата,
Хоць паліцца ў печы,
Ды зоркай крылатай
Раскінуўся вечар.

Сягоння да мамы
Прыехала ў госці.
Тут, быццам у храме,
Спакой з прыгажосцю.

У маміным сэрцы
Пяшчоты багата.
Разгушквае вецер
Бярозу над хатай.

Я гэтай пяшчотай
Хачу наталіцца,
Яна мне заўсёды
Пад раніцу сніцца.

Скрозь сум пазіраю
У родныя вочы.
У вершы складаю
Радок за радочкам.

Пра іней у веснічках,
Зорку крылатую,
Пра маміну песню
І маміну хату…

**Успаміны дзяцінства**

Каштан упёрся ў аблокі,
У вокны пазірае бэз –
Дзяцінства ўспамін далёкі,
Жыццёвай пірамiды змест.

Бабуля тупае ля печы,
І самакрутку смаліць дзед.
Прысеў на ганку цёплы вечар.
Пакінуў цень на сценцы след.

Мой родны кут… Старая хата –
Утульна, чысценька заўжды.
Магчыма, трошкі цеснавата,
Але было б тае бяды.

Падлогу мама падцірае –
Анучка мокрая ў руцэ.
Я за сталом сяджу, малая,
Лаўлю зацірку ў малацэ.

Якое гэта захапленне –
Дзяцінства светлы ўспамін!
Злавіла за крыло імгненне
Пяшчотна-казачных хвілін…

**Пяшчота**

*Маме*

Не забуду рук тваіх пяшчоту,
Стомленага сэрца цеплыню.
Гонкую бярозку каля плоту –
Зноў сюды ў думках зазірну.

Хай мяце, злуецца завіруха,
Грукае пад вокнамі мароз.
Буду вечар казкі твае слухаць –
Сёння мы абыдземся без слёз.

Да пляча матулі прытулюся –
Спыніць час свой стрымгалоўны бег.
У сваім дзяцінстве застануся
На пяшчотна-казачны начлег…

**Споведзь**

Жыццё пачаць бы з чыстага ліста…
Лістоў хапае. Часу небагата.
Мінулагодні снег даўно растаў,
Ды не трапляе сонца ў маю хату.

За рэчкаю выводзіць салавей
Каторы дзень пярэстыя каленцы.
На досвітку матуля пазаве.
Устану з ложка. Выбегу ў сенцы.

Паразмаўляю з зорачкай сваёй.
Паслухае, заўсёды зразумее.
Свой сум магу даверыць толькі ёй.
Яна мая пяшчота і надзея.

Яна выратавальніца заўжды.
Адзіная, крылатая, як мама.
Абняў каліну явар малады,
Суцішылася ранне каля брамы.

Жыццё пачаць бы з чыстага ліста…
Лістоў хапае. Часу небагата.
Мінулагодні снег даўно растаў,
Ды не трапляе сонца ў маю хату…

**Матуліна пяшчота**

Матульчынай пяшчоты не стае
І позірка, спавітага ў лагоду.
І толькі ў сны ўплятаюцца мае
Дзяцінства кірпаносага мелодыі.

Адкаласіла жыта да пары…
Збіраю ў кошык зорачкі да ранку.
Таўкуць у ступе крупы камары.
Маладзічок павіс над сонным ганкам.

Займае дыхаць. Слёзы не суняць.
Мне мамінай пяшчоты не хапае.
Хоць вочы зашывай – не хочуць спаць!
Успомнілася мама маладая.

Салоўкі пошчак будзіць цішыню.
Нанізвае самоту на праменьчык.
Ад жорсткасці дачушку захіну.
Прад мамінай пяшчотаю ўкленчу…

**Пацеркі росаў**

Восень шчыруе за кожным акном.
Сонейкам гронкі каліны наліты.
Зноўку агорне пяшчотным крылом
Ранак, у пацеркі росаў спавіты.

Мама ля прыпечка бульбу таўчэ.
Ціхенька песню пра Яся спявае.
Поўная сіл і бадзёрая шчэ.
Вельмі прыгожая і маладая.

Зараз схуднела ды ногі баляць.
Ходзіць з кіёчкам гаротная мама.
І адпачне, мо, разоў дваццаць пяць,
Покуль за хлебам даклэпае ў краму.

Рукі ад працы скруціла зусім.
Спаць не было калі нават уночы.
Вёсны лічыла, ды больш было зім.
Але засвецяцца радасцю вочы,

Калі збяромся сям’ёй за сталом.
Зноўку матулечка наша спявае.
Свецяцца вочы, і свеціцца дом,
Мама прыгожая і маладая…

**Ніхто не пашкадуе так, як маці**

Ні сын твой, ні дачушка, ні каханы –
Ніхто не пашкадуе так, як мама.
Укленчы перад ёй, пакуль жывая, –
Няхай пяшчота сны ёй спавівае.

Прыбегчы ці прыехаць не лянуйся.
Дапамажы. Пагавары. Не злуйся.
Няспынны час – такі халерны злодзей.
На жаль, сыходзяць людзі і стагоддзі…

Шчымлівыя хвіліны і імгненні,
Калі сядзеў у мамы на каленях,
У сэрцы застаюцца назаўсёды
Мажорна-апантанаю мелодыяй.

А мама можа ўсё і ўсё ўмее –
Аблашчыць, адратуе, зразумее.
Яна і немагчымае ўсё зробіць,
І да апошняга ўздыху будзе побач.

І нават па-за межамі Сусвету
Вандруе зорачкай крылатай следам…

**Маміна свята**

Зоркі ў акенца
Свецяць заўзята.
Іней у сенцах
Мамінай хаты.

Песціць світанак
Маміны вочы.
Ён без падману
Крочыць за ноччу.

У мамінай студні
Месяц начуе.
У свята і ў будні
Да мамы лячу я.

Дасць мне параду
І пашкадуе.
Мама мне рада –
Сэрцам адчую.

Маміна студня.
Маміна хата.
Дзён маіх будні –
Маміна свята…

**Мне б да мамы прытуліцца**

Тая ж студня. Тая ж хата.
Толькі мама адспявала.
Назаўжды памерла свята,
У якое яна звала.

Больш ужо не пацалуе,
Не сустрэне каля ганка.
У студні месячык начуе.
Вецер цягне калыханку.

Не абдыме, не аблашчыць.
Што баліць, не запытае.
Патанула маё шчасце
У слязах і ў адчаі.

Вецер кідаецца ў вокны,
І да раніцы не спіцца.
Мамін голас, вочы, крокі…
Мне б да мамы прытуліцца!

## Маміны вёсны

Ля хаты згорблены кіёчак.
У хаце стомленая мама.
Калісь недасыпала ночак.
Не спіцца й зараз ёй таксама.
Даўно ўжо дрэнна бачаць вочы.
Зусім не слухаюцца ногі.
Ды ўсё рабіць сама шчэ хоча
І не чакае дапамогі.
Але – не можа… Нават плача:
Старое – нібыта малое.
У маладосці ўсё іначай,
У старасці зусім не тое.
А мне не верыцца й дагэтуль,
Што вёсны маміны мінулі.
І толькі здымкаў і партрэтаў
Гады-зладзеі не кранулі.
У чаравічках на абцасах,
Сукенка модная заўсёды…
Не паддаецца памяць часу.
І я з ім не шукаю згоды…

**Мамін голас**

Чуць хачу пяшчотны мамін голас
Кожны дзень і кожную хвіліну.
Па зярнятку я збіраю ў колас
Добрыя пра маму ўспаміны.
Вось яна спявае калыханку.
Лашчыць мяне цёплаю рукою.
“Уставай, дзіцятка, – будзіць уранку. –
Сёння ў школу пойдзем мы з табою”.
Потым паляцела, нібы птушка,
З матчынай лагоднае далоні,
А яна ўсё плакала ў падушку:
“Хай дачушку гора не дагоніць.
Хай заўжды ўдача калыхае
І блішчаць ад шчасця яе вочы.
Хай каханне песні ёй спявае
І салодкі сон прысніцца ўночы”.
Ды жыццё мяне не шкадавала,
Круцячы ў коле-калаўроце.
Крыламі каханне памахала.
А гады бязлітасна малоцяць…
Сыпле долу зерне спелы колас.
Церуха запарушыла скроні.
Чуць хачу ласкавы мамін голас,
Цалаваць хачу яе далоні…

**Існасць жыцця**

Табе да твару й сівізна,
Што верх зняла над косамі.
Матуля, родная мая,
Ты – самая дзівосная.

Такой пяшчоты ў вачах
Нідзе не сустракала я.
Матуля, любая мая,
Ты – самая ласкавая.

І хоць зусім я не дзіця –
Сваіх даўно ўжо маю, –
У самоце жудаснай жыцця
Адну цябе гукаю.

Я так баюся іншы раз
Заўчасна прахапіцца,
Калі спявае мне ў снах
Цяпла твайго крыніца.

Твой пільны позірк праз гады
Паўсюль за мной вандруе.
А сэрца шчырае заўжды
Ад здрады адратуе.

Маркота згіне пакрысе,
І сінявокі ранак
Спатканне з мамай прынясе
Лагодаю на ганак.

**Кропля пяшчоты**

Што чалавеку старэнькаму трэба?
Позірк ласкавы. Лустачка хлеба.
Лепей каб мякіш, а не скарынка.
Пагаварыць з кім хоць бы хвілінку.

Супчыку міска. Кропля пяшчоты.
Нам жа таксама спатрэбяцца потым
Словы спагады, добрыя вочы…
Старасць не радасць, ды ўсе ў яе крочым...

**Душа паэта**

Незакончаны радок,
Песня недапета…
Жоўтага пяску грудок –
Сховішча паэта.

Прылятае па начах
У куток той Муза.
Зорны россып, Млечны Шлях…
Рамантычна дужа.

Працінаюць аж наскрозь
Тут пралесак вочы.
Дабрыня і прыгажосць
За натхненнем крочыць.

Не ўтаймуецца ніяк
І душа Паэта.
Прабівае зорны шлях
Нават з таго свету.

**Ці ж ты мяне чуеш**

Нам мулка, як разам,
Ды сумна адразу,
Калі паасобку.
Паставіць бы кропку…

Кахаю? Шкадую?
Ці ж ты мяне чуеш…
Крычыць перапёлка.
Мне ў ліпені золка.

Гаркавае зелле –
Кахання пахмелле.
Нічога не трэба –
Узняцца б у неба.

Ды там паспяваці,
Вучыла як маці.
Высока за хмарай,
Гаючаю марай.

Каб сэрцам, душою
Сустрэцца з табою.
Ды ты не лятаеш.
Знаць, доля такая.

І, пэўна, заўсёды
Не будзе ў нас згоды.
Кахаю? Шкадую?
Ці ж ты мяне чуеш…

**Шалёнае каханне**

Даў Бог табе выпрабаванне –
Маё шалёнае каханне,
Мае няўрымслівыя ласкі
І ночы каляровай казкі.

Мае гарэзлівыя слёзы,
Спякотны поўдзень у марозы,
Маё турботнае чаканне
Даў Бог табе – маё каханне.

Дня без цябе пражыць не хочуць
Цябе жадаючыя вочы.
А вусны прагнуць пацалункаў –
Ну, аніякага ратунку!

Як да крыніцы прыпадаю,
І зноў, і зноў цябе жадаю.
Даў Бог табе выпрабаванне –
Маё шалёнае каханне…

**Чаканне**

Чорнымі ніткамі сшыты мой лёс.
Шчасце дарэмна гукаю.
Камнем скацілася зорка з нябёс,
Тая, што пела мне ў маі.

Вочы патухлі, і голас прапаў.
Сэрца стамілася біцца.
Ды журавель, што ў снах прылятаў,
Даў мне пяшчоты напіцца.

Кожную ночку сузор’е нябёс
Той успамін калыхае.
Чорнымі ніткамі сшыты мой лёс
З пацерак слёз і адчаю.

**Хай уваскрэсне каханне!**

Песціць марозны ранак
Сонейка першы прамень.
Зычу ўсім закаханым
Гэты вясёлкавы дзень.

Хай ён імгненнем найлепшым
Кожнаму ў вочы зірне,
Хай і святых, і грэшных
Ён ад бяды захіне.

Зычу духмянага хлеба,
Веру, Надзею, Любоў,
Позірк блакітнага неба,
Шчырых, пяшчотных слоў.

Хай уваскрэсне каханне!
Люты адступіць убок,
Зорачка ў вокны загляне,
Месяц зайграе ў ражок…

**Сустрэча**

Блакітныя пацеркі зорак –
Стагоддзяў сівых капяжы.
Калі табе крыху за сорак
І восень ля самай мяжы.

Калі падгінае калені
Ды ветрам зламана крыло –
Імчыцца стралою імгненне,
А скроні твае замяло.

Не трэба цурацца кахання –
Яно адраджае сусвет.
Хай чырвань юначага рання
Пральле свае промні на след.

Хай вера, пяшчота і згода
Гняздо пад страхою саўюць
Ды птушкай пры хаце заўсёды
Для вас свае песні пяюць.

Цурацца кахання не трэба.
Хіба ж яно мае ўзрост?
Цалуюць вясновае неба
Дубы, верхавіны бяроз.

Да берага лашчыцца рэчка,
Спявае салоўка вясной.
Я вам прызначаю сустрэчу,
Адзіны, прыдуманы мой!

**Стаптаны абцас**

Ты не кахаў, відаць, нікога.
І мне шкада цябе, павер.
А я кахала, дзякуй Богу,
Кахаю нават і цяпер.

Каб не зманіць, кахала тройчы.
Каханне крылы мне дало.
Яно выпешчвала радочкі,
Вяночак з зорачак пляло.

Я сэрца слухала заўсёды,
А розум спаў у гэты час.
Неверагодныя прыгоды
Шукаў стаптаны мой абцас.

Ды ўсё ж блішчалі мае вочы.
Было ад шчасця і ад слёз.
І я падзякаваці хочу
За свята гэтакае лёс!

**Словы кахання**

Кажы мне словы пра каханне,
У сваю пяшчоту спавівай.
Няхай душа мая адтане
І супакоіцца няхай.

Хай зіхацяць ад шчасця вочы,
А вусны прагнуць вуснаў зноў.
Хай след у след за мною крочаць
Надзея, вера і любоў.

Кажы мне словы пра каханне,
Харошых словаў не шкадуй.
Надзея сэрца хай падмане
І адвядзе убок бяду.

Сягоння ў нас начуе згода.
А заўтра?.. Божа, памажы,
Каб цераз тыдзень і заўсёды
Спяваць хацелася і жыць.

**Поўня**

Нарэшце ты быў толькі мой.
Люляў мяне, нібы малую.
І зоркі соннай чарадой
Глядзелі ў цемру векавую.

Падперазаўшыся, як дзед,
Сачыў за імі месяц важны.
На сцежцы Млечнай кожны след
У срэбным рэшаце ўзважваў.

Прыціхла ўсё. Спыніўся час.
Імгненне знічкаю зляцела.
Душа гукала на Парнас
Бязважка-стомленае цела…

**Прылятай**

Твае словы бываюць гаючыя,
А бываюць да болю калючыя.
Толькі ты, любы мой, не знікай.
А хутчэй да мяне прылятай.

Адшукай мяне ў жніўні і ў верасні.
Ля духмянай сасны і на беразе,
Дзе чаруе вясёлкавы край.
Ды ніколі ўжо больш не губляй.

Я твой боль супакою лагодаю,
Зноў пяшчотаю стану і згодаю.
Утаплю ў калодзеж адчай.
Як было што не так, выбачай.

Буду дзень шчабятаць табе ластаўкай,
Напаю каляроваю казкаю,
Пераблытаем студзень і май.
Ты мой роспач, мой цуд, прылятай...

**Пад абразамі зорнай ночы**

Мы зноў адны ў цэлым свеце.
Маўкліва месяц у вокны свеціць
Мігаюць зоркі, нібы свечкі, –
Застыла на парозе вечнасць.

Бы немаўля, мяне люляеш,
У сваю лагоду спавіваеш,
Цалуеш рукі мне і вочы
Пад абразамі зорнай ночы.

Усяго сябе аддаць гатовы.
Хіба аб гэтым скажуць словы?
Твае далоні пахнуць маем.
Пад шэпты зорак засынаем…

**Зорны парасон**

У поўнач выбегу на ганак –
І пераблытаю гады…
Сустрэне месяц закаханы
Мяне, як хлопец малады.

Заплешча ветрык у далоні,
Пяшчотна ў валасы нырне,
Стракоча безупынку конік,
І клічуць зорачкі мяне.

Лячу з усмешкай за аблокі –
Трымаю зорны парасон.
З мелодыяй вянчаю слоўкі.
Спявае ветрык наўздагон.

Заплюшчыць вочы не паспела –
Аблашчыў сонейка прамень.
А я б да зор яшчэ ляцела!
Ды пачынаўся новы дзень…

**Вачам паверу**

Гойдае вецер дрэвы,
Сцёбае дождж калючы,
Птушак не чутна спеваў,
І на душы балюча.

Посцілкай неба шэрае –
Сумна і нецікава.
Словам тваім паверу,
Добрым паверу справам.

Сінім вачам паверу,
Дужым рукам пяшчотным.
Буду кахаць без меры!
Век жа такі кароткі…

Гойдае дрэвы вецер.
Хутка зіма настане.
Зоркі запаліць вечар,
Змрок над зямлёй растане…

**Адчай**

Я вып’ю з рук тваіх атруту,
Нібы свянцоную ваду.
І, скінуўшы зямныя путы,
На небе зоркай узыду.

Дзе Млечны Шлях ляжыць спрадвечна,
Пануе холад і спакой,
Душа мая ўспыхне свечкай –
Якраз над хатаю тваёй.

Я буду берагчы, каханы,
Твой палахліва-прагны сон.
А завітае сіні ранак,
Растану, як крыштальны звон…

**Адну мяне**

У тое лета не вярнуся,
Дзе ты мне косы расплятаў,
Дзе росным ранкам белы бусел
Над нашай хатай пралятаў.

Гадоў праз колькі, можа, потым
Былы напеў ускалыхне.
Зноў назавеш сваёй пяшчотай
Адну мяне, адну мяне.

І будзеш пацеркі да золку,
Як успаміны лепшых сноў,
У каляровую вясёлку
Збіраць пад стрэхамі гадоў.

Рамонкі, ружы і валошкі,
Якія мне не падарыў.
Вянок лагодных слоў харошых,
Якія мне не гаварыў.

Загляне месяц у акенца,
У калодзеж зорка зазірне.
Ты, босы, выбежыш у сенцы
Сустрэць пяшчоту і мяне…

**Змест**

Мелодыя верша
Родная мова
Якубу Коласу
У госці да Максіма
Ля помніка Янку Купалу
Спыніся, момант!
Паэзія – госця нябесная
Мова прыгажосці
Матчына мова
Дзе палыхае зарыва брусніц...
Святло лучыны
Мова прадзедаў
Спадчына
Пахне вёска сырадоем
Мой ранак
Сэрца Беларусі
Зямля бацькоў
Мая вуліца
Малая радзіма
Край бяроз і журавін
Душа адпачывае
Вуліцы, завулкі і двары
Дарога дадому
Паланянка
Талісманы вернасці
Раніца ў вёсцы
Пяшчоты не стае
Без мамы
Атручанае рэха
Роздум
Развітальная

Прызнанне
Зарапад летуценняў
Спяшаюся ў лес
Паркалёвыя мары
Мілагучнасць лета
Зімовым вечарам
Зоркі ў чоўне
Зіма-чараўніца
Закаханы шпачок
Навальніца
Абуджэнне
Хатынскія званы
Брацкая магіла
Востраў дзяцінства
Халодная хата
Успаміны дзяцінства
Пяшчота
Споведзь
Матуліна пяшчота
Пацеркі росаў
Ніхто не пашкадуе так, як маці
Маміна свята
Мне б да мамы прытуліцца
Маміны вёсны
Мамін голас
Існасць жыцця
Кропля пяшчоты
Душа паэта
Ці ж ты мяне чуеш...
Шалёнае каханне
Чаканне
Хай уваскрэсне каханне!
Сустрэча

Стаптаны абцас
Словы кахання
Поўня
Прылятай
Пад абразамі зорнай ночы
Зорны парасон
Вачам паверу
Адчай
Адну мяне

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**БАГДАНОВІЧ (Мартыненка) Лёля Уладзіміраўна**

# КАЛЕЙДАСКОП ЛЕТУЦЕННЯЎ

Вершы

Рэдактар
*Т. М. Якаўлевіч*

Дызайн вокладкі
і камп'ютарная вёрстка
*Л. У. Гатавіцкая*

ГА "Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі".
Пл. Свабоды, 13-1, 220013, г. Мінск.
Тэл./факс: 8(017) 347 08 60.
E-mail: maaspb.m@yandex.by
www.maaspb.by